



# ПАД ПЯЧАТКАЙ ЧЫРВОНАГА ДРАКОНА

**У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстаўка традыцыйнага кітайскага і карэйскага жывапісу “Жамчужыны Усходу”**

Гэты праект рэалізаваны ў супрацоўніцтве з Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, Інстытутам Канфуцыя МДЛУ і Маскоўскім клубам аматараў кітайскага жывапісу.

На выстаўцы прадстаўлена каля сотні работ, выкананых у розных тэхніках, якім ужо больш дзвюх тысяч гадоў. Напрыклад, жывапісам гунбі (у перакладзе “старанны пэндзаль”) упрыгожваліся імператарскія палацы. Тут патрабуецца дакладная прапрацоўка вобразаў. Контур наносіцца лініямі, таўшчыня, глыбіня і кірунак якіх могуць мець сімвалічнае значэнне. Пасля выява пакрываецца некалькімі пластамі тонкай празрыстай мінеральнай фарбы, якіх можа быць да пяцідзесяці. І так ствараецца далікантны вобраз. Таксама ў экспазіцыі пададзены работы ў тэхніках магуфа, мінхва, се-і, мастацтва каліграфіі.

Беларускія, расійскія і кітайскія мастакі для сваіх работ выбіралі кветкі, птушак, рыб, пейзажы. Кожная карціна мае адметную пячатку, таксама агульная пячаць у выглядзе чырвонага дракона распрацавана для ўсёй выстаўкі. Калі бачыш гэтыя незвычайныя карціны, ствараецца ўражанне, што трапляеш у іншы свет, які складаецца з загадкавых казачных вобразаў, сэнсаў і нават наказаў, якія праз жывапіс стагоддзямі перадаваліся на Усходзе. Усе работы нясуць у сабе адбітак філасофіі і рэлігійных уяўленняў, будызму, даасізму і канфуцыянству. Для чалавека, які толькі адкрывае для сябе такое мастацтва, тут мноства загадак. Яны могуць быць нават у назвах карцін, якія гучаць як асобны расповед. Калі ўважліва разглядаць мастацкія творы, можна заўважыць цікавыя дэталі. Так на ўсходзе на кветках, лістах паказаны казуркі ці іншыя жывыя істоты. Экспазіцыя дапоўнена веерамі ручной работы, інструментамі, неабходнымі для малявання.

Ганна **Трошына**

Фота Алены Дзядзюлі



